Отчего в суде заплакал бывший замминистра здравоохранения – читайте на 2-й стр.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 4 (4359)

15 студзеня 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!



100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ

З якой печы ўпалі Высоцкая і Марзалюк?

Паўстанцаў 1863 года вешалі і расстрэльвалі публічна, а хавалі таемна. Публічна, на плошчах – каб застрашыць жывых, таемна, у недаступных месцах – каб ніхто не мог пакланіцца магілам герояў. 128 пакараных смерцю, і – ні надмагільнага крыжа, ні курганка, закопвалі, як жывёлу. Мала таго, карнікі залівалі магільныя ямы гашанай вапнай, каб і парэшткі растварыліся, каб немагчыма было па нейкіх прыкметах у будучыні распазнаць пахаваных.

Гэтая пасмяротная экзекуцыя прыгадалася мне нядаўна, калі ў Беларусі пачалася чарговая хваля шальмавання Кастуся Каліноўскага. Уздымаліся падобныя хвалі і раней – дзьмухаламі-адзіночкамі, і таму заўважнай шкоды не нарабілі. Цяпер жа хваляванне пайшло сур'ёзнае, на дзяржаўным узроўні.

Спачатку ў новых падручніках васьмікласнікі прачыталі, што Каліноўскі кіраваў «польскім паўстаннем». Потым чыноўніца Мінадукацыі **Людміла Высоцкая** ў адмысловай заяве залічыла Каліноўскага ў «польскія мяцежнікі». А найбольш дасталося Каліноўскаму ды ягоным гераізатарам ад гісторыка-дэпутата Ігара Марзалюка, які на старонках «Настаўніцкай газеты» (орган Міністэрства адукацыі) проста выкрасліў паўстанне 1863 года з аналаў нацыянальнай гісторыі.

І Высоцкая, і Марзалюк займаюць не апошнія прыступкі ў пірамідзе дзяржаўнай улады, але пасля такіх заяў бачацца мне з вёдрамі вапны ў руках. З незразумелым мне імпэтам яны гасяць Каліноўскага ды ягоных паплечнікаў, каб было не пазнаць, не разабрацца, хто і за што ў тым паўстанні змагаўся. Даўней гасілі акупанты, а цяпер – свае.

Апомніцеся, гасіцелі! Называючы паўстанне Каліноўскага польскім, вы льяце ваду на крамлёўскі млын інтэграцыі, чыё кола зноў зарыпела, прыводзячы ў рух імперскія жорны. Для Масквы любы крок беларусаў да самастойнасці здаўна лічыўся польскай інтрыгай, нават захоп Полацка Іванам Жахлівым лічыўся «вызваленнем ад палякаў» (згадайма фільм «Цар», дзе ролю «няправільнага» мітрапаліта Філіпа бліскуча выканаў Алег Янкоўскі).

Таму і Каліноўскі з-за зубцоў Крамля звыкла трактаваўся як польскі мяцежнік, а ягоную «Мужыцкую праўду» маскоўскія славянафілы называлі «паскудным польскім лістком, поўным паклёпаў на Расію». Чаму польскім? Бо газета выходзіла на беларускай лацінцы, разбірацца ў якой маскавіты жадання не мелі. Лацінка – значыць, пальшчызна.

Што ж, ім даравальна. У чужой царкве, як вядома, свечак не папраўляюць. Але чаму ў адну дудку з Масквой адносна паўстання 1863 года стала дзьмуць беларускае Міністэрства адукацыі? І чым не дагадзіў Каліноўскі новаабранаму члену-карэспандэнту Нацыянальнай Акадэміі навук Ігару Марзалюку? На якой падставе яны зладжаным дуэтам заспявалі пра «польскае паўстанне» 1863 года?

Хіба паролем паўстанцаў не былі знакамітыя словы: «Каго любіш?» – «Люблю Беларусь!» – «Дык узаемна!»

Хіба Каліноўскі не пісаў сваю палымяную публіцыстыку па-беларуску?

Хіба не па-беларуску напісаў развітальны верш да каханай «Марыська чарнаброва, галубка мая»?

Хіба не звяртаўся ў сваіх «Лістах з-пад шыбеніцы» наўпрост да беларускага люду, адмяжоўваючыся ад дзеянняў Варшавы словамі: «Каб знаў свет Божы, як мужыкі-беларусы глядзяць на маскалёў і паўстанне польскае»?

Хіба варшаўскі паўстанцкі ўрад на поўным сур'ёзе не называў Каліноўскага «праўдзівым апосталам беларускага народа»?

Хіба той жа ўрад не адхіляў яго ад кіраўніцтва паўстаннем, пазбавіўшы паўнамоцтваў і забраўшы пячатку?

Хіба на адных толькі беларускіх землях не дзейнічала каля 220 паўстанцкіх атрадаў (68.000 касінераў – мясцовых людзей, а не дэсантаваных з-пад Варшавы ці Кракава!), якія разбілі рэгулярныя расійскія войскі пад Мілавідамі і вызвалілі ад акупантаў Пружаны, Ружаны, Горкі ды іншыя гарады і мястэчкі?

Хіба не былі паўстанцамі беларускія пісьменнікі Францішак Багушэвіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Альгерд Абуховіч і Арцём Вярыга-Дарэўскі?

Хіба не зведаў Сібіры паўстанец Зыгмунт Чаховіч – духоўны бацька Янкі Купалы?

І такіх «хіба» можна назбіраць цэлы «БелАЗ» з прычэпам. То з якой печы ўпаўшы Высоцкая і Марзалюк называюць нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863 года польскім? Ах, ксяндзоў сярод паўстанцаў было шмат? А куды падзець 14 праваслаўных святароў, якія былі пакараны ў 1864-м?

Як ні напінай гужы, з якога боку ні пад'едзь, а не спіхваецца Каліноўскі з беларускага п'едэстала, не рэкрутуецца ў польскія паўстанцы. А стоячы на п'едэстале, ён непераадольная перашкода на шляху «інтэгратараў» – хто ж не помніць запавет, выкрыкнуты з-пад маскоўскай шыбеніцы: «Толькі тады, народзе, зажывеш шчасліва, калі над табою маскаля ўжо не будзе».

Таму і працягваецца мурашыная валтузня ля падножжа героя. Не з'ямо, то хоць панадкусваем. Не спіхнём з пастамента, то хоць на галаву нагадзім. Ці проста абальём гашанай вапнай, знявечым да непазнавальнасці, як тое рабілі акупанты, раздаючы здраднікам медалі «За усмирение польского мятежа». Як выглядае, новапрызначанаму расійскаму паслу самы час заказаць новую партыю тых медалёў…

УЧОРА

Беларусь і Венгрыя падпісалі мемарандум паміж міністэрствамі замежных спраў аб садзейнічанні міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву

Акрамя таго, падпісана міжурадавае беларуска-венгерскае пагадненне аб садзейнічанні ажыццяўленню і ўзаемнай абароне інвестыцый. Міністэрства замежных спраў Беларусі і Міністэрства замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі таксама падпісалі праграму супрацоўніцтва на 2019 год.

З беларускага боку подпіс пад дакументамі паставіў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства **Уладзімір Макей**, з венгерскага – міністр замежных спраў і знешняга гандлю **Петэр Сіярта**.



БЕЛТА.

ПАЗІЦЫЯ

Лукашэнка пра канфлікт ва Украіне: гэта непаразуменне трэба заканчваць



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пацвярджае сваю пазіцыю аб неабходнасці хутчэйшага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне. Аб гэтым ён заявіў сёння на сустрэчы з украінскім палітычным і дзяржаўным дзеячам Віктарам Медзведчуком.

«Гэта непаразуменне (інакш не назавеш) трэба заканчваць. Брацкія рэспублікі, народы... Робім нашым ворагам і сапернікам падарунак сваімі рукамі», – сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яму важна пачуць пазіцыю Віктара Медзведчука па многіх пытаннях, асабліва па тых падзеях, якія разгортваюцца ва Украіне. *«Для мяне гэта важна не толькі таму, што я асабіста балею за тое, што там адбываецца, але і таму, што гэта наша родная Украіна. Я і служыў, шмат разоў бываў там, ды і не ўтойваю, што мае старажытныя карані ідуць кудысьці туды, паміж Чарнігавам і Кіевам*, – падкрэсліў беларускі лідар. – *Яшчэ асновай усяму з'яўляюцца і нашы адносіны з Украінай. І ў пачатку гэтага канфлікту, паводле нашых дадзеных, а мы дакладна вялі ўлік, да 150 тысяч чалавек хлынуў паток з Украіны. І мы прадаставілі ім роўныя ўмовы і правы з нашымі беларусамі. Хоць тады было няпроста. Але, дзякуй богу, усё абышлося. Нехта назад вярнуўся, нехта ездзіць тудысюды, а нехта асталяваўся, жыве і працуе тут як нашы блізкія, родныя людзі. Ёсць і негатыўныя фактары падзей, якія там адбываюцца. Я аб гэтым публічна заўсёды гавару»*.

Віктар Медзвядчук падзякаваў за магчымасць сустрэчы і цёплыя словы аб Украіне. *«Сапраўды, сёння наша краіна перажывае многія праблемы. І я тут хачу адзначыць вашу асабістую ролю і ролю Беларусі ў мірным урэгуляванні ў Данбасе. Беларусь прадаставіла перагаворную пляцоўку, былі падпісаны вядомыя ва ўсім свеце мінскія пагадненні. Нягледзячы на тое, што яны, на вялікі жаль, не выконваюцца, гэта адзінае пагадненне, якое існуе як план мірнага ўрэгулявання ў Данбасе. І ўсе бакі разумеюць тое, што мір можа быць толькі на ўмовах, падпісаных у Мінску»*, – сказаў палітык.

Ён дадаў, што і сам з 2014 года бярэ ўдзел у перагаворным працэсе, а таму часта бывае ў Мінску. *«Для многіх украінцаў, якія хочуць міру ў Данбасе, Мінск стаў не проста пляцоўкай брацкага, дружалюбнага беларускага народа, але яшчэ і надзеяй, што мірнае ўрэгуляванне ўсё ж такі настане»*, – дадаў Віктар Медзвядчук.

(БЕЛТА.)

СВЕТСКАЯ ЖИЗНЬ

Татьяна Короткевич сходила на Большой новогодний бал

Как правило, белорусские оппозиционные политики нечасто посещают подобные мероприятия. Сопредседатель кампании «Говори правду!» решила сломать эту традицию. Специально для бала в Большом театре оперы и балета Татьяна Короткевич взяла несколько уроков танцев и пошила на заказ красивый наряд.



– В прошлом году на одной из женских встреч мне рассказали про бал в Большом театре, и я решила, что хочу на него попасть, – *рассказала Татьяна «Народной Воле»*. – И вот попала!

Мероприятие и вправду очень красивое, торжественное, нестандартное, праздничное. Несмотря на то, что оно проходит уже в десятый раз, я для себя открыла бал в Большом только в этом году. И очень удивилась, что, оказывается, если у тебя есть билет на бал, ты можешь ходить в театр на репетиции, учить классические танцы. Я не сразу поняла, что весь кайф, оказывается, в подготовке к балу. Потому что танцевали на балу не профессиональные танцоры и артисты, а именно те, кто ходил на эти репетиции. Некоторые приезжали на репетиции даже из регионов!

В общем, для меня открылся новый мир, о существовании которого я до этого вообще понятия не имела.

На балу я, конечно, немного танцевала, участвовала в нескольких мастер-классах. И это очень вдохновляюще! А как некоторые пары танцуют – загляденье просто!

– Знаю, что некоторые заказывают платья для бала чуть не за полгода…

– Я не такая *(смеется)*. Но тоже подошла серьезно к этому вопросу. И вместе со стилистом Натальей Ильинской придумала свой костюм.

Я отметила для себя, что из присутствующих на балу около 500 человек знаю лишь несколько персон – знаменитого Валентина Елизарьева,



директора театра Владимира Гридюшко, несколько чиновников из Мингорисполкома. И, пожалуй, все. Другими словами, почти ни с кем не знакома! Хотя публика, которая приходит на бал в Большой театр, – это тоже социально активные люди! И это открытое пространство для знакомств, общения, впечатлений. И ты видишь жизнь совсем с другой стороны.

Поэтому предлагаю в следующем году белорусским политикам основательно подготовиться и пойти на бал в Большой!

– Вы на бал наверняка ведь не одна ходили?

– Конечно, не одна. С коллегой. Чтобы не надо было партнера по танцам искать. Вальсировали, танцевали блюз, фотографировались – там очень много фотозон было организовано. Мне все очень понравилось!

– До самого утра вальсировали?

– Мы ушли уже после трех часов ночи. И время пролетело совершенно незаметно.

Марина КОКТЫШ.

ДЫПКУР'ЕР

Уладзімір МАКЕЙ: «Абедзве краіны павінны быць прадстаўлены на ўзроўні амбасадараў»

На мінулым тыдні амерыканскі часопіс Foreign Policy паведаміў пра тэлефанаванне ў Дзяржддэпартамент ЗША міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея. Ён паведаміў, што абмежаванні на колькасць амерыканскіх дыпламатаў у Мінску зняты. МЗС пацвердзіў інфармацыю пра размову Макея з кіраўніцтвам Дзяржаўнага дэпартамента ЗША. І іх было некалькі. Аднак дэталі не раскрываюцца.

Учора падчас сустрэчы з журналістамі Уладзімір Макей заявіў, што Беларусь зацікаўлена развіваць нармальнае супрацоўніцтва з ЗША. Ён адзначыў, што Злучаныя Штаты – гэта вялізны рынак для беларускіх тавараў. Міністр прыгадаў часы, калі Вашынгтон уводзіў санкцыі ў дачыненні Беларусі, і падкрэсліў, што Мінск быў вымушаны на іх адказаць. Але цяпер настаў час перагледзець тыя састарэлыя догмы, якія былі ў двухбаковых адносінах, сказаў Макей.

Міністр замежных спраў распавёў, што дыялог з ЗША ідзе на розных узроўнях. Стаіць задача пашырыць "пазітыўную атмасферу ў супрацоўніцтве". "*Абедзве краіны павінны быць прадстаўлены на ўзроўні амбасадараў, павінны мець нармальныя палітычныя і эканамічныя кантакты, дачыненні*", – цытуе Макея БЕЛТА.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Отчего в суде заплакал бывший замминистра здравоохранения?

Минский городской суд рассматривает уголовное дело о коррупции в медицине в отношении бывшего замминистра здравоохранения Игоря Лосицкого и бывшего главврача 12-й стоматологической поликлиники Минска Владимира Кравчёнка.



Интерес к данному судебному процессу велик. На первое заседание в суд пришли десятки журналистов, что объяснимо. На скамье подсудимых бывший высокопоставленный чиновник, который курировал в Минздраве вопросы закупок медоборудования и товаров медицинского назначения, а также их регистрацию на рынке, был председателем тендерной комиссии УП «Белмедтехника», которая принимала решения о том, какой товар у кого и по какой цене покупать за бюджетные деньги. И если вспомнить, как в июне-июле 2018 года председатель КГБ **Валерий Вакульчик** комментировал громкие задержания в сфере медицины – а он говорил о том, что все задержанные замешаны в коррупционных закупках, из-за чего иногда цены на лекарства и медицинское оборудование необоснованно завышались на 10–60 и даже на 100%, – то можно было предположить, что в ходе этого судебного заседания прозвучат некоторые факты о том, как данные схемы работали. Тем более что из обвинения вытекало, что Лосицкий брал взятки за организацию централизованных закупок оборудования начиная с 2015 года. С момента задержания и до сих пор Игорь Лосицкий находится в СИЗО КГБ, в суд его привозят под конвоем.

Но, можно сказать, никаких новых громких сенсационных фактов в суде не прозвучало. В итоге Игорю Лосицкому предъявлено четыре эпизода получения взяток.

В августе 2015 года в ресторане «Раковский бровар» он получил взятку в размере 1500 долларов от директора компании по продажам лабораторного оборудования «Белреас» **Михаила Гохмана** за благоприятное решение вопроса поставок оборудования по спонсорской помощи в 4-ю больницу Минска данной компанией. «*Большого труда оказывать это содействие не составляло, и оно проходило практически автоматически*», – говорил в суде Игорь Лосицкий. На уточняющий вопрос прокурора **Юрия Шерстнева** «*Я так понимаю, вы выполнили свою функцию, те действия, которые входили в вашу компетенцию?*» *ответил: «Так точно, не нарушая ни актов, изданных Министерством здравоохранения, ни актов, которыми руководствовался в центре испытаний, ни приказов – ничего»*.

В феврале 2016 года вознаграждение за благоприятное решение вопроса Лосицкий уже получил от представителя эстонской компании в Беларуси **Зеленко**. На этот раз 10 тысяч долларов. Это была плата за то, что Лосицкий помог компании с *допуском к участию в конкурсе по закупке с незарегистрированным в Беларуси оборудованием. В 2017 году тот* же Зеленко вручил Лосицкому еще 10 тысяч евро. И наконец четвертый эпизод датирован октябрем 2016 года. Деньги Лосицкий получил от главврача 12-й стоматологической поликлиники Кравчёнка (поэтому их дела и рассматриваются вместе) в размере 2 тысяч долларов. Кравчёнок просил помочь с регистрацией в Беларуси швейцарских стоматологических имплантов, которые прошли клинические испытания на Западе, но регистрация которых тормозилась в нашей стране. Кравчёнок просил Лосицкого помочь ускорить процесс, потому что его дочь тогда подрабатывала в фирме, которая и занималась поставками этих имплантов в Беларусь и была встревожена долгой нерегистрацией. Лосицкий говорил в суде, что не знал о том, что в передаваемом пакете вместе с бутылкой хорошего спиртного окажется конверт с деньгами, потому что хорошо знал Кравчёнка еще по курсам в БелМАПО. «*Не одну бутылку водки вместе выпили*», – рассказывал Лосицкий. Говорил, что и без денег «*сто пудов помог бы*» Кравчёнку...

Адвокат Игоря Лосицкого **Людмила Лаврукович** в ходе допроса по каждому эпизоду задавала вопрос своему подзащитному: «*Своими действиями вы нанесли урон Минздраву, нашему здравоохранению?*» Тот отвечал: «*Нет, конечно! Действий, идущих вразрез с моими обязанностями, не совершал, никогда не преступал закон в рамках его законодательных моментов*».

Взяткодателей – Гофмана и Зеленко – на данный момент нет в Беларуси. Гофман уехал на ПМЖ в США, Зеленко в бегах. «*Скрывается от уголовного преследования где-то в Прибалтике. Мне так в ходе допроса говорили оперативники*», – пояснил суду Лосицкий. Кравчёнок же в суде показал, что передача двух тысяч долларов Лосицкому – это его инициатива, бывший чиновник о взятке ничего не знал.

Из показаний Лосицкого получалось, что все вопросы, за которые он получал вознаграждения, и так решились бы в рабочем порядке, но свою вину в получении взяток признал полностью.

Стоит отметить, что в суде Игорь Лосицкий, который, к слову, заметно похудел, держался уверенно. На все вопросы отвечал быстро, перед началом процесса активно приветствовал родных, которые пришли его поддержать, – жену, родного брата и других близких. Махал им из клетки рукой, улыбался, подмигивал, давая, видимо, понять, что он не сломлен, что все у него хорошо, насколько это может быть в данной ситуации. И только один раз Игорь Лосицкий не удержался и смахнул слезу – когда рассказывал о своей болезни, о том, какую приходилось терпеть боль. В суде он, к слову, говорил, что все полученные взятки тратил на лечение и только однажды – на обучение младшего сына, который учится на платном отделении в Белорусском государственном медуниверситете. Этот рассказ бывшего замминистра здравоохранения в некоторой степени характеризует работу нашей медицины.

По словам Лосицкого, у него сильно болела спина, но в «*нашем доблестном РНПЦ*» ему поставили неверный диагноз, долго неправильно лечили, делали блокады в поясничный отдел – и все равно это не помогало. Тогда он попросил почему-то Александра Мрочека (директора РНПЦ «Кардиология». – ***Авт.***), чтобы ему сделали повторную МРТ. «*Доктор и медсестра по своей инициативе сделали ее немножко ниже, захватив тазобедренные суставы. На этой томографии было определено, что у меня некроз головки бедренной кости, поражены оба тазобедренных сустава, правый – в большей степени*».

Хирург Минздрава настоятельно рекомендовал Лосицкому операцию по замене тазобедренного сустава. Ревматолог же советовала сустав сохранить, лечиться консервативно и познакомила Лосицкого с ревматологом из Казахстана, где якобы успешно использовали в лечении таких заболеваний современный китайский препарат. В Беларуси он зарегистрирован не был. Лосицкий покупал лекарство за собственные деньги. Понадобилось 6 курсов, каждый стоил по 1,5 тысячи долларов. Также параллельно с этим лечением четыре раза в каждый сустав ему вводили препарат, «*который увеличивает смазывание головки сустава и не дает кости тереться о кость*». Один укол на тот момент стоил более 1 миллиона неденоминированных рублей, то есть потребовалось более 12 миллионов. «*Принимал достаточно большое количество обезболивающих, потому что боль была страшная, трамадол уходил пачками: две таблетки на завтрак, две на ужин. В пачке – 10 таблеток, – рассказывал в суде Лосицкий. – После того как я узнал о данном заболевании, после первой томограммы, я у Василия Ивановича (Жарко, который тогда был министром здравоохранения. –* ***Авт.****) просился отпустить меня на другую работу*».

Но Жарко не отпустил, потому что, по словам Лосицкого, он курировал строительство ПЭТ-центра и новой поликлиники в РНПЦ онкологии. И только новый министр **Валерий Малашко** позволил Игорю Лосицкому лечь в больницу. В 2017 году в 6-й клинической больнице Минска ему сделали операцию по замене тазобедренного сустава правой ноги. Поставили не белорусский, а импортный протез, на который также требовались деньги.

На все лечение, подчеркивал Лосицкий в суде, ушло 14 тысяч долларов! И это, заметим, в стране с бесплатной медициной!

В суде Лосицкий рассказывал и о том, как он скромно живет. В феврале этого года ему исполнится 52 года. До назначения на должность замминистра он работал начальником управления здравоохранения Брестской области (с 2007-го по 2013 год), до этого 6 лет являлся главврачом Брестской областной больницы. Но в Бресте с семьей жил в квартире тестя. С переводом на работу в Минск год жил в служебном жилье депутата на ул.Красноармейской, потом – в общежитии БГМУ на проспекте Дзержинского, и только в 2016 году благодаря ходатайству Минздрава Лосицкий вступил в кооператив Следственного комитета и построил собственную квартиру на ул.Острожской. Прокурор попросил уточнить, что еще есть в собственности у Лосицкого. Может, земельный участок, вклад в банке? «*Ничего нет*, – ответил бывший замминистра. – *Только кредит*».

Допрос Лосицкого закончился тем, что он еще раз раскаялся в содеянном. «*На первом допросе в КГБ я написал явку с повинной*, – констатировал Игорь Лосицкий. – *Все средства возмещены мною полностью*».

Выходит, в коррупционных схемах, из-за которых бюджет страны терял огромные деньги, чиновник, отвечающий за регистрацию и закупку медоборудования, не участвовал, а оказался мелким взяточником. Или стоит дождаться других судебных разбирательств, чтобы сделать окончательные выводы? Пока в Генпрокуратуру не переданы дела бывшего руководителя «Белмедтехники» **Александра Шарака**, в гараже которого нашли 620 тысяч долларов, бывшего директора РНПЦ травматологии и ортопедии **Александра Белецкого**, у которого оперативники при обыске обнаружили 500 тысяч долларов. Под следствием до сих пор находится один из первых задержанных по этому делу – бывший руководитель Центра экспертиз и испытаний в здравоохранении **Александр Столяров** и многие другие чиновники, которые, по сути, были в подчинении у Игоря Лосицкого.

В ТЕМУ

«Не устоял перед соблазном»

Поликлиника зарабатывала в год миллион долларов, а ее руководитель не отказывался от взятки в 300 рублей

В деле Лосицкого–Кравчёнка в центре внимания судебного заседания чаще оказывается последний. Ему предъявлено не менее 10 эпизодов получения взятки. Суммы разные – от 15 тысяч евро до 300 белорусских рублей. Всего суммарно с 2013-го по 2018 год Кравчёнок получил незаконным путем более 25 тысяч долларов. По его делу в суде будет допрошено около 50 свидетелей, первых суд заслушал вчера.

Владимир Кравчёнок более 40 лет работает в стоматологии, с 2005 года был главврачом 12-й поликлиники. Видимо, хороший хозяйственник, потому что имеет много грамот, медаль «За трудовые заслуги».

– *Хотел создать лучшую поликлинику в Беларуси, чтобы уровень лечения соответствовал мировым стандартам, – говорил он в суде. – Мы провели реконструкцию и постоянно перевыполняли планы по зарабатыванию денег, поэтому оборудование покупали за внебюджетные средства. Денег хватало... Мы имели возможность платить зарплату выше, оформляли медицинские страховки для сотрудников и так далее.*

Только в 2017 году возглавляемая Кравчёнком поликлиника заработала более 1 миллиона долларов внебюджетных денег. Казалось бы, зачем соблазняться на мелкие взятки? Неужели 25 тысяч долларов, полученные Кравчёнком за 5 лет, он не мог заработать законным путем? Об этом «Народная Воля» спросила его в перерыве судебного заседания.

Зарплата главврача, по словам Кравчёнка, последнее время составляла 1500–1700 рублей. Но выписать себе премию из внебюджетных средств он не мог: премирование главврача – это прерогатива Комитета по здравоохранению. Взять деньги из внебюджета на поездку на международный конгресс тоже не мог, говорит, что это большая волокита, коррупция, и поэтому, когда одна из компаний предложила заплатить 300 долларов за его поездку на научный форум в Барселону в 2016 году, он согласился принять эти деньги. А сейчас это один из эпизодов получения бывшим главврачом взятки.

Наибольшие суммы Кравчёнок получал от директора компании «Геол-М» **Владимира Ладутько**. В 2013 году – за то, что поликлиника приобрела у этой компании компьютерный панорамный томограф с функцией 3D, в 2017-м за то, что купили у нее четыре стоматологические установки. В первом случае после окончания сделки Ладутько передал Кравчёнку 10 тысяч долларов, во втором – 15 тысяч евро. Но Кравчёнок в суде подчеркивал, что никогда не договаривался о вознаграждении как условии сделки, ничьи интересы не лоббировал, что выбирал самое лучшее на тот момент оборудование для поликлиники и никогда не требовал от своих подчиненных подгонять техническое задание под технические характеристики аппаратов, предлагаемых конкретной фирмой. «*Благодарить – это была личная инициатива дающих*», – говорил он. На что прокурор Шерстнев заметил, что эти показания противоречат тому факту, что в ходе следствия Кравчёнок признал себя виновным по статье «Злоупотребление служебными полномочиями». «*Как вы это объясните?*» – спросил гособвинитель. «*Я понимал, что, если бы не был главврачом, никто бы мне эти деньги не дал*, – ответил Кравчёнок. – *К сожалению, я не принял решения вернуть эти деньги… Не устоял перед соблазном*». Взятки Кравчёнок, по его словам, тратил на бытовые расходы, отдых и оплату обучения младшей дочери в БГМУ. На вопрос об отношении к обвинению он ответил четко: «*Вину признаю полностью. Искренне и глубоко раскаиваюсь. Ущерб мною возмещен в полном объеме*».

Как долго будет длиться рассмотрение уголовного дела Лосицкого–Кравчёнка, никто прогнозировать не берется. Адвокат бывшего замминистра Людмила Лаврукович предположила, что судебное заседание продлится как минимум месяц.

Мария ЭЙСМОНТ.

ПАДЗЕЯ

Беларуская моладзь памоліцца з Папам Рымскім

Дэлегацыя каталіцкай моладзі з Беларусі возьме ўдзел у сусветных днях каталіцкай моладзі, якія сёлета адбудуцца ў Панаме.

У склад дэлегацыі ўвойдуць 27 чалавек. 16 студзеня яны з Вільнюса самалётам праз Франкфурт-на-Майне накіруюцца ў Панаму. Дэлегацыю ўзначаліць дапаможны біскуп Гродзенскай дыяцэзіі **Юзаф Станеўскі**.

«*У склад беларускай дэлегацыі ўвойдуць як зусім маладыя людзі – школьнікі, студэнты, так і тыя, хто ўжо працуе*, – распавядае ксёндз **Антоні Грэмза.** – *Гэта будуць маладыя людзі і святары з самых розных парафій. Прычым, паколькі паездка будзе нятанная, то ў кожнай з парафій, адкуль будуць ехаць маладыя людзі, парафіяне збіралі ім грошы на білет*».

Паводле слоў ксяндза **Антонія**, праграма сусветных дзён каталіцкай моладзі абяцае быць насычанай.

«*Напачатку мы возьмем удзел у днях місійных у адной з Панамскіх дыяцэзій*, – распавядае ксёндз Антоні. – *Дарэчы, нас прымае дыяцэзія Калона Куна-Ялы. Для нас гэта будзе вельмі цікава, паколькі сярод вернікаў дыяцэзіі пераважна мясцовыя жыхары. Мы падзелімся з імі сваім духоўным досведам, традыцыямі і спадзяёмся пазнаёміцца з іх жыццём*».

22 студзеня адбудзецца галоўная сустрэча ў сталіцы Панамы, дзе пройдуць сумесныя катэхізы, а таксама сустрэча з Папам Рымскім Францішкам.

«*Сумесныя катэхізы будуць адбывацца па моўных групах, і наша беларуская дэлегацыя будзе сярод рускамоўных краін. У гэтай групе разам з намі будуць дэлегацыі з Казахстана, Узбекістана і іншых краін*», – распавядае ксёндз Антоні.

Ён дадае, што на сустрэчах дэлегацыя прадставіць у запісе гімн Сусветных дзён каталіцкай моладзі на беларускай мове, а таксама прагучыць малітва на беларускай мове.

«*Апрача гэтага, наша дэлегацыя будзе апранута ў беларускія вышыванкі, вязём з сабою беларускія сувеніры, будзем прадстаўляць сваю культуру і адметнасць*», – падкрэслівае ксёндз Антоні.

Сусветныя каталіцкія дні моладзі адбываюцца раз на тры гады, сёлетнія па ліку ўжо 34-я. Апошнія адбываліся ў Кракаве ў 2016 годзе.

Міхал КАРНЕВІЧ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Усё робяць для таго, каб абцяжарыць жыццё гаспадару…»

Аляксандр Бяльчук з Маларыцкага раёна, які ў свой час трапіў пад крымінальны пераслед за тое, што бараніў сваю ўласнасць, распавёў, як жывецца і працуецца зараз.

Нагадаем: у снежні 2016 года выйшаў з СІЗА ў Брэсце маларыцкі фермер **Мікалай Бяльчук**, які адбыў пакаранне двухмесячным арыштам за гвалт у дачыненні да супрацоўніка міліцыі. Такі прысуд быў вынесены Брэсцкім раённым судом за канфлікт з супрацоўнікам ДАІ ў 2014 годзе.

Таксама адбываў пакаранне і брат Мікалая – **Аляксандр Бяльчук**. Яго абвінавацілі ў супраціве міліцыянерам, які ён быццам бы ўчыніў 12 кастрычніка, калі амапаўцы забіралі Мікалая па месцы жыхарства ў вёсцы Арлянка Маларыцкага раёна.

У выніку Аляскандр быў асуджаны на тры месяцы арышту за непадпарадкаванне супрацоўніку міліцыі і нанясенне яму цялесных пашкоджанняў.

Браты баранілі свой самаробны трактар, які збіраліся забраць супрацоўнікі ДАІ.

– Я пра той выпадак ужо амаль не ўспамінаю, на гэта проста не хапае часу, – распавёў «Народнай Волі» **Аляксандр БЯЛЬЧУК**. – У мяне даволі вялікая гаспадарка, таму спраў і так хапае. Хаця дзяржава і зараз палкі ў колы ўстаўляе, усё робяць для таго, каб абцяжарыць жыццё сапраўднаму гаспадару.

– А калі больш канкрэтна…

– Шмат розных момантаў ёсць. Напрыклад, было ў мяне памяшканне для дойкі кароў з сілавым блокам на 380 вольт. Прыехалі электрыкі, адключылі гэты блок. Куды я толькі не звяртаўся! І ў вобласць, і ў Мінск… Адказ паўсюль аднолькавы: «Вам у 1999 годзе сілавы блок быў праведзены памылкова». Тэхнічны праект быў, грошы заплаціў, усё было нармальна. А зараз вочы ў іх расплюшчыліся, «памылку» ўбачылі.

Задаваў пытанне ва ўсе інстанцыі: чаму тады не прыцягнуты да крымінальнай адказнасці той чалавек, які ў свой час правёў мне электрычнасць памылкова? Маўчаць як рыбы. І яны ж ведаюць, што кароў мне даіць усё роўна патрэбна, а таму можна садраць з гаспадара яшчэ больш грошай. Таму нічога іншага не заставалася, як купіць генератар ды набываць для яго бензін.

– Наколькі мне вядома, былі праблемы і з арэндай памяшканняў, ці не так?

– Калі браў памяшканне ў арэнду, то далі самае горшае. У мінулым годзе каровы на снезе ў снежні стаялі, таму гандлявацца асабліва не было часу. І не было з чаго выбіраць, таму пагадзіўся на тое, што прапанавалі.

Толькі пацяплела, дах у памяшканні



поўнасцю пацёк. Напісаў прэтэнзію арэндадаўцу, што той не выконвае абавязкі па дамове, мне прыходзіць адказ: «Капітальны рамонт даху будзе праводзіцца ў IV квартале 2018 года». Чакаю. Прайшоў 2018 год – рамонту так і не дачакаўся. Але атрымліваю паперку: «З 1 студзеня 2019 года павялічана арэндная плата». Дык хто робіць такія разлікі? У памяшканні няма ні электрычнасці, ні вады, дах дзіравы, а плату яны павышаюць. А добрыя адрамантаваныя памяшканні стаяць, іх мне не даюць. Чакаюць, напэўна, пакуль на цагліны разбяруць.

Зараз напісаў таксама ліст, што ў сувязі з павелічэннем пагалоўя прашу даць мне ўчастак, які знаходзіцца ў карыстанні сельскага Савета. Адмовілі. У сувязі з тым, што ўчастак перададзены ў часовае карыстанне мясцоваму калгасу. Прашу даць іншы ўчастак. Ізноў адмова. А зараз даведваюся, што ўсю гэтую зямлю калгас аддае нейкаму невядомаму фермеру. Вось такое ў мясцовага начальства стаўленне да сваіх людзей, якія працуюць на гэтай зямлі ад цямна да цямна. Можа быць, гэтае начальства трэба спачатку нечым зацікавіць, каб нешта ад яго атрымаць?

– У вас шмат кароў, малако здаяце на завод?

– Я не маю на гэта права, бо не зарэгістраваны як юрыдычная асоба, таму малако забірае ў мяне пасрэднік. І тут таксама нясу вялікія страты, бо тлустасць заніжаецца. Напрыклад, здаў за 10 дзён чатыры тоны малака, па тлустасці зразаюць каля паўтоны. І яшчэ паўтоны здымаюць па нейкай формуле.

І праўду таксама не знойдзеш. Я хацеў, каб тлустасць пры мне вызначалася, дык не – не пагаджаюцца. Таму што ведаюць, што будуць у пралёце. Адным словам, складана працаваць, ціснуць з усіх бакоў.

– Якая ў вас гаспадарка на гэты момант?

– 63 гектары зямлі, 75 галоў рагатай скаціны, каля 60 кур. Раней яшчэ шмат свіней трымаў, але давялося ўсіх парэзаць. Сказалі, што ў раёне эпідэмія, каранцін на шэсць месяцаў.

– І сям'я ж у вас немалая…

– Вось тут я багаты: у мяне 8 дзяцей і 10 унукаў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СИТУАЦИЯ

Шахтеры и калийщики обратились к Наталье Кочановой

В своем письме к главе Администрации президента они требуют регистрации первичной профсоюзной организации УСП «Трест» «Реммонтажспецстрой» и отстранения от должности заместителя председателя Солигорского райисполкома по идеологической работе А.П.Страпко.

В Администрацию президента обращение вместе с резолюцией, принятой делегатами конференции НПГ, направлено 11 января.

Вот выдержки из этой резолюции:

«Мы, делегаты конференции ППО ОАО «Беларуськалий» БНП, выражаем протест в связи с нерегистрацией первичной профсоюзной организации работников УСП «Трест «Реммонтажстрой» БНП.

Конференция констатирует, что члены Солигорского районного исполнительного комитета… игнорируют Конституцию РБ, законодательство Республики Беларусь, не руководствуются требованиями инструкции №48 от 30.08.2005. Министерства юстиции РБ, Генерального соглашения между правительством и профсоюзами, Трудового кодекса РБ, Директивы Президента РБ №2 от 27.12.2006., Указа Президента РБ «О социальном партнерстве» №278.

Отказами в регистрации ППО УСП «Трест «Реммонтажстрой» БНП члены Солигорского райисполкома показали свою некомпетентность и нежелание руководствоваться принципами социального партнерства, желание любыми методами помешать гражданам в их добровольном объединении в профсоюз.

…Данные действия нарушают… Всеобщую декларацию прав человека и Конвенцию МОТ №87, что подрывает имидж Республики Беларусь на международном уровне, а у граждан – веру в закон и справедливость…

Мы, делегаты конференции, требуем от Солигорского райисполкома не доводить ситуацию до уровня социальной напряженности, прекратить волокиту и бюрократию и зарегистрировать ППО УСП «Трест «Реммонтажстрой» БНП, требуем освободить от занимаемой должности заместителя председателя райисполкома по социальным вопросам и идеологической работе Страпко А.П. за действия противоречащие принципам социального партнерства и бездействие, как председателя Совета общественных организаций Солигорского района».

Лариса НАСАНОВИЧ.

СЛЫШАЛИ?

Китайцы хотят построить в Национальном аэропорту терминал

Как известно, в октябре прошлого года занимавший в то время пост министра транспорта и коммуникаций Анатолий Сивак заявил, что Минтранс планирует начать строительство нового терминала в Национальном аэропорту «Минск», поскольку действующий терминал не справляется с пассажиропотоком. Однако окончательное решение о сроках начала строительных работ объекта не принято. Правда, в планах начать стройку после Европейских игр, которые пройдут в июне 2019 года, а завершить к чемпионату мира по хоккею в 2021 году.

Но желающие строить терминал уже есть. Это Китайская авиационная промышленная корпорация. Авиационный институт проектирования и дизайна, который входит в корпорацию, на своем сайте опубликовал компьютерный графический эскиз проекта. Указано, что пропускная способность нового терминала площадью 36 тысяч квадратных метров составит три миллиона человек в год.

Стоит отметить, что китайцы уже хотели участвовать в реконструкции Национального аэропорта и в свое время предлагали построить там вторую взлетно-посадочную полосу за 1,2 млрд долларов. Белорусская сторона от этого предложения отказалась, и вторая взлетно-посадочная полоса была построена собственными силами, она начнет принимать самолеты уже весной этого года.

НЕДВИЖИМОСТЬ

Цены на квартиры в Минске снизились

Но квадратный метр в новостройках белорусской столицы стоит дороже, чем в Киеве.

Риелторы отмечают: за минувшую неделю индекс цен на квартиры в Минске опустился на 0,2% и составил 1314 долларов за квадратный метр. Средняя цена квартир в новостройках Минска снизилась за неделю на 0,3% и составила 1264 доллара за квадратный метр. Любопытно, что в Киеве, где жилье традиционно было дороже, чем в Минске, сегодня в квадратный метр в новостройках стоит 923 доллара.

К СЛОВУ

Дешевле всего в Витебске

А какие цены на рынке недвижимости в областных центрах? К началу этой недели, сообщает realt.by, там сложилась следующая ценовая ситуация:

Брест – 770 долл./м^2 (+0,1%),
Витебск – 593 долл./м^2 (+0,5%),
Гомель – 626 долл./м^2 (-0,5%),
Гродно – 677 долл./м^2 (+0,1%),
Могилев – 624 долл./м^2 (-0,1%).

СТОЛИЦА


Каких специалистов не хватает Минску?

В топ-9 наиболее востребованных в столице специальностей входят:

1.инженеры – 667;
2.медсестры – 639;
3.врачи-специалисты – 535;
4.арматурщики – 507;
5.повара – 486;
6.уборщики помещений – 456;
7.водители – 422;
8.плотники-бетонщики – 454;
9.продавцы – 425.

КНІГАРНЯ

«Споведзь» Ларысы Геніюш выйшла ў Чэхіі



Мемуары славутай беларускай пісьменніцы Ларысы Геніюш выйшлі ў свет па-чэшску ў перакладзе Святланы Вранавай (*на фота*). Па прафесіі арнітолаг, яна самастойна пачала вывучаць беларускую мову і, як прызналася ў сацсетках, паехала ў Беларусь, каб папрактыкавацца ў вусным маўленні. «*Упершыню трапіўшы ў Мінск, я амаль не пачула беларускай мовы, і мяне ўсе сталі адгаворваць: маўляў, па адных падручніках мову не вывучыш. А я сказала: вывучу!*». І Святлана не толькі вывучыла, але і занялася перакладамі. Раней дзякуючы ёй выйшла ў Чэхіі кніга Паўла Севярынца «Любіць Беларусь», цяпер – «Споведзь» Л.Геніюш. Дарэчы, пісьменніца, якая ў сталінскія часы была прыгаворана да 25 гадоў ГУЛАГу, да гэтай пары ў Беларусі не рэабілітавана.

Антон ЗАГОРСКІ.

ПАРТЫЙНАЯ ПАЗІЦЫЯ

«Народная Воля» працягвае друкаваць артыкулы актывістаў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) па актуальных праблемах, хутчэйшым вырашэннем якіх павінны быць занепакоены беларускія ўлады.

Фаіна НАКАНЕЧНАЯ, сябра БСДП, магістр правоў чалавека і паліталогіі

Блокчэйн – новая тэхналогія для правядзення выбараў, а таксама адзіны інфармацыйны рэгістр

Блокчэйн (англ. *Blockchain*) зараз лічаць геніяльным вынаходніцтвам не толькі ў тэхнічна развітых краінах. З часоў свайго з'яўлення блокчэйн ператварыўся ў нешта большае. Але вялікая колькасць людзей пакуль не ведае, што такое блокчэйн і як ён працуе.

«Маці» блокчэйна – гэта крыптаграфія, якая з'явілася яшчэ каля 4 тысяч год таму ў якасці перадачы паведамленняў праз сімвалы. Але гэта была прымітыўная форма, якую яшчэ цяжка назваць крыптаграфіяй.

Асноўным ключом да стварэння крыптаграфіі стала неабходнасць сакрэтных пасланняў падчас Другой сусветнай вайны. Самай першай электрычнай шыфравальнай машынкай была польская «Энігма». Пасля неаднаразовых узломаў сістэмы «Энігмы» з'явілася вызначэнне крыптаграфіі з сіметрычным ключом.

Як працавала сістэма?

У цябе і твайго суразмоўцы ёсць пэўны набор лічбаў і сімвалаў. Праз гэты набор вы ажыццяўляеце дыялог, які ніхто іншы не зможа зразумець, бо не ведае, як расшыфроўваюцца сімвалы і лічбы.

Але і потым, збольшага з прычыны недасканаласці сістэмы абароны дыялогаў, гэта сістэма пачала ўдасканальвацца і дапаўняцца.

Так і з'явіўся блокчэйн. Ён дазваляе лічбавай інфармацыі, якая будзе размеркавана ў інтэрнэце, быць картатэкай дадзеных. Першапачаткова блокчэйн быў распрацаваны для лічбавай валюты Bitcoin. Зараз знайшлі іншыя магчымыя варыянты выкарыстання тэхналогіі як размеркавальнай базы дадзеных.

Уявіце табліцу, якая дубліруецца тысячы разоў у сетцы камп'ютараў. Затым уявіце, што гэтая сетка прызначана рэгулярна абнаўляць гэтую табліцу і ў вас ёсць агульнае ўяўленне аб blockchain.

Інфармацыя, якая захоўваецца на blockchain, існуе як агульная. База дадзеных Blockchain захоўваецца не ў якім-небудзь адным месцы, што абазначае адсутнасць цэнтралізаванай версіі гэтай інфармацыі. Дадзеныя даступны на мільёнах камп'ютараў адначасова і для ўсіх у інтэрнэце.

З аднаго боку, дадзеныя даступныя, але яны яшчэ і «непадкупныя»

Сетка blockchain аўтаматычна правярае сябе кожныя дзесяць хвілін. Свайго роду самастойная аўдытарская экасістэма лічбавага значэння. Сетка ўзгадняе кожную транзакцыю, якая адбываецца ў дзесяціхвілінных інтэрвалах. Кожная група гэтых аперацый згадваецца як «блок».

Змяніць персанальныя дадзеныя і прыватную інфармацыю ў blockchain без дазволу канкрэтнага чалавека тэарэтычна немагчыма. Трэба перакрыць усю сетку блокчэйн і выкарыстоўваць велізарную колькасць вылічальнай магутнасці, каб узламаць персанальны кабінет ці сістэму персанальных кабінетаў уладальнікаў.

Напрыклад, у Эстоніі і Фінляндыі, каб змяніць істотныя дадзеныя аб грамадзяніне (гендарная прыналежнасць, голас на выбарах і г.д.), неабходна мець ідэнтыфікацыйную картку і спецыяльны код з паролем доступу. І ў 90 працэнтах гэта будзе доступ праз мабільныя прылады з вясёлкавай абалонкай вока ці адбіткам пальцаў.

Новая ступень развіцця blockchain – гэта менавіта голас на выбарах. У сакавіку 2018 года першапраходнікам у гэтым стала афрыканская краіна Сьера-Леонэ. Там арганізавалі падлік і запіс галасоў і з улікам блокчэйна, і традыцыйным спосабам.

Вынікі выбараў прэзідэнта ў гэтай краіне на фоне грамадзянскай вайны набываюць павышанае значэнне. З 1961 года большую частку месцаў у парламенце займалі канкурыруючыя Партыя ўсенароднага кангрэса і Народная партыя Сьера-Леонэ.

На гэты раз у бюлетэнях былі пазначаны імёны 16 кандыдатаў ад самых розных палітычных сіл. Тэхнічную падтрымку і рэалізацыю ініцыятывы забяспечыў швейцарскі стартап Agora, які займаўся распрацоўкай прыватнага блокчэйна. Падобныя блокчэйны з правамі доступу даюць магчымасць прызначаць удзельнікаў, адказных за прыняцце рашэнняў.

Выкарыстанне блокчэйна дазваляе не толькі знізіць рызыкі ўмяшання ў працэс галасавання, але і арганізаваць абнародаванне вынікаў больш хутка. Вынікі выбараў Agora абвясціла на дзве гадзіны хутчэй за выбарчую камісію.

Якім чынам можа працаваць галасаванне ў блокчэйне?

Арганізатары выбараў ствараюць лічбавы кабінет для кожнага, і ў кожнага выбаршчыка будзе адзін электронны голас, які ён зможа аддаць за аднаго з кандыдатаў. Грамадзяне галасуюць ананімна праз свой віртуальны аватар, адпраўляючы свой голас. Блокчэйн фіксуе і пацвярджае гэта. Пераможца вызначаецца паводле колькасці галасоў.

Але і гэта не мяжа, якую дасягнула галасаванне праз блокчэйн.

У Аўстраліі арганізацыя пад назвай «Нейтральныя блокі галасавання» (англ. Neutral Voting Bloc, NVB) выкарыстоўвае не толькі галасаванне на блокчэйне. У прыватным кабінеце кожны грамадзянін можа зарэгістраваць сваё меркаванне і пытанне па палітыцы, калі галасуе на выбарах.

Калі падыходзіць час вырашаць гэтыя пытанні, выбраныя палітыкі кіруюцца меркаваннем сваіх грамадзян, сабраным з дапамогай блокчэйна.

Зусім новы эксперымент з галасаваннем прайшоў у горадзе Цуг у Швейцарыі. У лістападзе 2017 года там была запушчана сістэма ідэнтыфікацыі праз электронныя мабільныя прылады.

Жыхары, якія валодаюць электроннай ідэнтыфікацыяй, ужо прагаласавалі на муніцыпальных выбарах летам 2017 года. Больш за 90 працэнтаў выбаршчыкаў прызналі, што гэты спосаб з'яўляецца больш зручным у параўнанні са звычайным галасаваннем.

Ці магчыма галасаванне праз блокчэйн у Беларусі?

Тэарэтычна галасаванне магчыма толькі праз этап збору дадзеных. Такі збор дадзеных магчымы праз наладжванне рэгістра выбаршчыкаў. Нават аўстралійскі прынцып з пытаннямі да кандыдатаў і палітычных партый зможа скараціць бюракратыю пры зваротах грамадзян.

Так як публічны блокчэйн можа прааналізаваць любы жадаючы, кожны карыстальнік мае магчымасць адсачыць лёс свайго звароту.

Але такую сістэму можна паспрабаваць узламаць. Праз складанасць падліку пратаколаў электроннага галасавання, патэнцыяльных камп'ютарных памылак і хакерскіх нападаў выбарчыя камісіі ў Казахстане (2011) і Нідэрландах (2008, 2017) вярталіся да папяровых бюлетэняў і скрыняў.

Не дапусціць гэтага можна толькі з дапамогай моцнай крыптаванай абароны і падтрымкі збоку IT-супрацоўнікаў.

БСДП выступае за ўвядзенне практыкі правядзення электронных рэферэндумаў нацыянальнага і мясцовага значэння. Вынікі гэтых рэферэндумаў маюць выключна кансультацыйны характар.

Як гэта можа працаваць на практыцы?

У Аўстраліі рэферэндумы ў сістэме блокчэйн выступаюць як «вадкая дэмакратыя» (Liquid Democracy).

К концу 1970-х годов, присутствуя на партхозактивах, я стал замечать, что Петр Миронович как руководитель республики и ее главный партийный функционер заметно изменился, поменялся его управленческий стиль. В машеровских выступлениях исчезли административный диктат, напор и свойственные ему в прошлом нравоучения. На смену пришли своеобразные философские размышления, рассуждения. Помню, он говорил, что при огромном научном потенциале в республике отсутствует фундаментальная наука, без которой нельзя сделать полноценную эффективную экономику. Что мелкие отраслевые научные исследования, текущие разработки в области промышленной сборки не в состоянии обеспечить научно-техническое величие республики. С досадой и волнением он говорил о том, что Госплан и военно-промышленные гиганты СССР сбрасывают нам «грязные» предприятия – могилевское «Химволокно», Гродненский азотнотуковый завод и другие.

Было также удивительно слышать из его уст откровенные публичные размышления об идеологическом кризисе в СССР. Не видел я уже и былой машеровской мажорности. Да и откуда было взяться оптимизму, когда дряхлая, вялая кремлевская власть ничего, кроме умиротворяющей демагогии, беднеющему с каждым годом народу предложить не могла.

1980 год был для Машерова, можно сказать, апокалиптическим. Его сопровождали всяческие неприятности, огорчения. Ни одна поездка в Москву не проходила без накачек, недовольства, понуканий: что-то не выполнил, что-то недовыполнил, что-то не поставил, где-то белорусская милиция «накосячила», маньяка не поймали, а невинного человека расстреляли и т.п. А сколько здоровья ему стоило строительство аэропорта Минск-2! Финансов не дают, стройка заморожена, а впереди зима. Он носился на этот объект чуть ли не через день.

Обобщая собственные наблюдения, размышления, прихожу к выводу, что к началу 1980-х годов П.М.Машеров потерял веру в то, во что прежде свято верил, а следовательно, потерял и волю к власти, интерес к созидательной жизни. Накануне рокового дня его постоянный шофер попросился на заслуженный отдых: мол, хромает здоровье, нет сил… Петр Миронович задумался, дружески похлопал верного помощника по плечу и серьезно сказал: «Потерпи, немного потерпи, мой друг, уйдем вместе…»

…В окаянный октябрьский дождливый день я шел за гробом Петра Мироновича и плакал. Мне было искренне жаль не руководителя белорусской партии коммунистов, не главу республики, а просто хорошего человека. Если бы не случилась трагедия, то Машеров свой жизненный путь закончил бы, как и все его соратники: в комфорте, обеспеченном персональной пенсией союзного значения. Не думаю, что он стал бы яростным борцом за интересы трудового народа, оппозиционером-демократом. Поэтому не имеет смысла создавать в народных умах образ этакого дерзкого оппонента Кремля, новатора, реформатора. Он был зеркалом своего времени, винтиком коммунистической системы. Но, будучи человеком из народа, умным и душевным, страдал, видя ее несовершенство…

ЧУЛІ?

Дэпутаты Беластока патрабуюць вярнуць беларусам візы «на закупы»

Рада горада Беластока прыняла 11 студзеня пастанову ў справе скасавання віз «на закупы» для беларусаў. Беластоцкія дэпутаты ад імя «Грамадзянскай платформы» патрабуюць ад міністра замежных спраў Польшчы вярнуць візы. Аб гэтым паведамляе польскае «Радыё Рацыя».

Дэпутаты Беластока настойваюць, што скасаванне віз «на закупы» адмоўна адаб'ецца на падляшскай эканоміцы ды памежных стасунках паміж беларусамі і палякамі. Паводле меркавання дэпутата Эвіты Худзік, на гэтым рашэнні страцяць не толькі беларусы, але таксама беластоцкія прадпрымальнікі.

«Ліквідацыя віз «на закупы» спрычыніцца да страт беластачан, якія працуюць у сферы паслуг і гандлю, – перакanана Худзік. – *Пры адначасовых абмежаваннях, уведзеных яшчэ і беларускім бокам, гэта можа прывесці, па праўдзе кажучы, да ліквідацыі гандлёвага турызму, можа абмежаваць і парушыць нашы добрасуседскія дачыненні».*

Нагадаем, што польскі ўрад з 2 студзеня скасаваў візы «на закупы» для грамадзян Беларусі. З года ў год беларусы ўсё менш купляюць у падляшскіх крамах. Паводле дадзеных польскай мытні, у 2018 годзе грамадзяне Беларусі купілі тавараў на 618 мільёнаў злотых. Гэта на 50 мільёнаў менш, чым у 2017 годзе. Яшчэ ў 2014 годзе беларусы купілі на Падляшшы тавараў на 1 мільярд злотых.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ЗАКУЛИСЬЕ

После долгой разлуки...

Известный белорусский хореограф Валентин Елизарьев на днях встретился с выдающимся танцовщиком Михаилом Барышниковым. Елизарьев был на спектакле Барышникова в Вильнюсе. «Народная Воля» расспросила Валентина Николаевича об этой встрече.



«Мы не виделись с ним, наверное, лет 50, – говорит Валентин Елизарьев. – *Хотя отношения все это время поддерживали, приветы друг другу передавали. И я, конечно, рад, что нам удалось пообщаться после спектакля. Очень сердечная получилась встреча, вспоминали нашу юность…*

Михаил Барышников был на сцене полтора часа. «Бродский/Барышников» – это моноспектакль, созданный по стихам Иосифа Бродского, с которым Барышников дружил более 20 лет. Два эмигранта. Две легенды.

Режиссер постановки – руководитель Нового Рижского театра Алвис Херманис».

Михаил Барышников называет его «своим» режиссером.

«Декорация спектакля напоминает венскую оранжерею, стеклянный дворец, – рассказывает Барышников о спектакле. – *На Рижском взморье стояли такие стеклянные сооружения – Иосифу бы это понравилось, эта декорация вызывает много ассоциаций. Этот спектакль – диалог с ушедшим человеком. Но если говорить о ностальгии, то в нем есть ностальгия по общему для нас с Бродским Нью-Йорку. Этот спектакль – о горечи отсутствия, ушедшего ежедневного общения, о тех местах, где мы бывали вместе. До сих пор, когда я прохожу мимо китайской харчевни или греческой кофейни, где мы сиживали вместе, у меня приостанавливается дыхание. Это были замечательные дни, недели, практически ежедневное общение, и Нью-Йорк остался для меня местом трепетным. Я ведь и познакомился с Бродским в Нью-Йорке. Вся интонационная гамма спектакля – нью-йоркская. В этом спектакле есть Гудзон, Ист-Ривер, Гринвич-Виллидж. Дух города присутствует в этом спектакле. Мои взаимоотношения с Иосифом в основном связаны с Нью-Йорком».*

«На мой взгляд, спектакль очень тяжелый, немного депрессивный даже, – рассказывает о своих впечатлениях Валентин Елизарьев. – *Это спектакль-раздумье, спектакль, который ставит бесконечные вопросы…*

Публика, кстати, смотрела его очень внимательно, чутко и напряженно. В конце аплодировали, но «Бис!», «Браво!» никто не кричал».

Михаил Барышников остался в Канаде во время гастролей в 1974 году. С тех пор он ни разу не приезжал в Россию. Не выступал Барышников и в Минске, хотя наверняка собрал бы полный зал.

«Я предложил Михаилу сделать постановку в нашем театре, но он сказал, что балетмейстер – не его профессия», – говорит Елизарьев.

Кстати, билеты на вильнюсский спектакль Барышникова стоили от 55 до 100 евро.

Марина КОКТЫШ.

ЛИЧНОЕ ДЕЛО

Михаил Барышников – артист балета, балетмейстер, актер, коллекционер и фотограф. В 1967–1974 годах был ведущим солистом в Ленинградском театре оперы и балета имени Кирова. В 1974 году во время гастролей в составе труппы Большого театра в Канаде, получив приглашение от своего давнего знакомого Александра Минца в труппу "Американского театра балета", стал невозвращенцем. В 1974–1978 годах – премьер труппы "Американский театр балета" (Нью-Йорк), в 1980–1989 годах был также ее руководителем; оказал существенное влияние на американскую и мировую хореографию. В 1978 году дебютировал в кино. В 1985 году сыграл роль танцовщика, убегающего от советской власти, в кассовом фильме «Белые ночи». В 1989 году дебютировал на Бродвее, сыграв в драматическом спектакле «Превращение» по повести Франца Кафки. В 1990 году вместе с танцовщиком и хореографом Марком Моррисом организовал «Проект «Белый дуб» (Флорида), занимавшийся постановками и изысканиями в области современного танца. Возглавлял его до 2002 года. В 2005-м открыл Центр искусств Барышникова.

ІМПРЭЗА

Крылы натхнення Уладзіміра Ліпскага

«Светлы, сонечны чалавек. У кожным слове яго – паззія», – сказала пра Уладзіміра Ліпскага народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч. Творчы вечар з нагоды саракагадовага юбілею пісьменніка на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка» прайшоў у Тэатры юнага гледача.



У аснове літаратурнага спектакля «Дзялюся крыламі», пастаўленага заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі, рэжысёрам **Валерыем Анісенкам**, былі ўрыўкі з твораў Уладзіміра Ліпскага, якія чыталі сябры аўтара.

Вядомы журналіст, публіцыст, дырэктар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» **Мікалай Супрановіч** распачаў імпрэзу, перадаўшы аўтару сігнальны экзэмпляр яго новай кнігі «Цар». А далей сказаў:

– *Мы шмат гадоў трывала супрацоўнічаем з Уладзімірам Сцяпанавічам. За гэты час выйшла многа кніг, былі арганізаваны цікавыя праекты. Адзін з іх – «Бібліятэка часопіса «Вясёлка»: серыя прысвечана беларускім дзіцячым пісьменнікам, якія рабілі свае першыя творчыя крокі на старонках часопіса. З новых праектаў асабліва вылучаецца серыя «Асобы». Ужо выйшлі кнігі пра акадэміка Віктара Парфёнава, касманаўта Пятра Клімука, вучонага-аграрыя Аляксея Скакуна, пісьменніка Рыгора Бабчанка.*

Адна з кніг з серыі «Асобы» выдадзена і да 75-годдзя Уладзіміра Ліпскага. Вядома, аб'ектам творчасці пісьменніка заўсёды з'яўляецца родная Беларусь, яе жыхары, гісторыя – цікавая, часам пакутлівая. Сам юбіляр прызнаваўся:

– *Беларусь – маё дыханне, мая душа… Мы багата чаго аддалі ў музеі: лапці, жорны, кажухі, плугі. Але ніколі не здадзім у іх сваё гонар, сціпласць, працавітасць, сумленне, любоў да зямлі, дадзеныя Богам. На Купалле ўсе мы, беларусы, шукаем папараць-кветку. А мне здаецца, што папараць-кветка – гэта наша Беларусь! Давайце знойдзем яе ў сваім сэрцы!*

З урыўкамі з твораў Уладзіміра Ліпскага выступілі народная артыстка Беларусі **Марыя Захарэвіч**, заслужаны артыст **Леанід Улашчанка**, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, вядомы артыст і рэжысёр **Валерый Анісенка**, **пісьменнікі Анатоль Зэкаў, Васіль Дранько-Майсюк, Рыгор Бабчанок**, артыст тэатра і кіно **Віталь Халадок**, вядучы спартыўных праграм Белтэлерадыёкампаніі **Стас Ліпскі** і нават даўнія сябры па Усебеларускім фестывалі народнага гумару ў Аўцюках.

Падчас вечарыны Уладзімір Ліпскі згадваў пра самых блізкіх яму людзей, маці і бацьку, якім прысвяціў кнігі «Маці. Малітва сына» і «Бацька. Пісьмы на неба». Казаў:

– *Вайна скрала маё дзяцінства, але так склалася лёс: усё свядомае жыццё я працую з дзецьмі. Маці суцяшала мяне малога, калі разам з хатай згарэлі ўсе мае цацкі: «Не плач, будуць у тваім жыцці новыя казкі…» Так і адбылося: сорак гадоў я на пасадзе галоўнага рэдактара дзіцячага часопіса «Вясёлка». Ці не казка гэта?*

Павіншаваць любімага пісьменніка з розных куткоў краіны прыехалі маленькія прыхільнікі яго творчасці. Вершы Уладзіміра Сцяпанавіча чыталі пераможцы рэспубліканскага дзіцячага конкурсу «Жывая класіка» **Вераніка Хогіна і Злата Качэрба,** а таксама невядучая дзяўчынка са Слуцка, неадноразовы пераможца конкурсаў чытальнікаў **Ульяна Палазнік**. Адзін з «хроснікаў» пісьменніка спявак **Іван Буслай**, які атрымаў шанц на іншае жыццё дзякуючы падтрымцы Дзіцячага фонду, зрабіў пісьменніку музычны падарунак: выканаў прыгожую песню «Вея» на словы сёлетняга лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне» **Юліі Быкавай**.

Пацешылі гледачоў творамі любімага аўтара самыя юныя ўдзельнікі спектакля – артысты з дзіцячага садка «Ліхтарык».

Віншаванне юбіляру даслаў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Карлюкевіч.**

Напрыканцы вечарыны Уладзімір Ліпскі сказаў:

– *Схіляю сваю заснежаную галаву перад усімі, хто чытаў мае творы са сцэны тэатра. Удзячны сардэчна маім шчырым вясёлкаўцам, маёй вялікай сям'і за падтрымку і канкрэтную дапамогу. Асаблівая падзяка гледачам, якія зрабілі тэатральную залу набітай і натхнёнай (нават не чакаў, што будзе столькі людзей, колькі сяброў, знаёмых і незнаёмых прыйшло на мой вечар!). Свята не адбылося б і без паважлівага стаўлення ўсіх без выключэння работнікаў Тэатра юнага гледача, упраўлення культуры горада.*

Сябры-пісьменнікі, давайце смялей выходзіць на вялікія сцэны да сваіх чытачоў!

Кацярына МЯДЗВЕДСКАЯ.
Фота Аляксандра КАМЕНЧУКОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 СТУДЗЕНЯ 2019 г.

ЧУЛІ?

Герасімені і Скардзіна адмоўлена...

Адпаведныя дзяржструктуры не падтрымалі былую біятланістку, алімпійскую чэмпіёнку Надзею Скардзіна і плыўчыху, двухразовую віцэ-чэмпіёнку Алімпіяды Аляксандру Герасіменю, якія прапанавалі стварыць радыёстанцыю «Спорт FM».

Чыноўнікі назвалі праект «немэтазгодным».

Праўда, як паведамляюць крыніцы «Народнай Волі», ёсць і іншая версія. Не выключана, што паважаных і вядомых спартсменаў маглі проста выкарыстаць у якасці лабістаў расійскага праекта па схаваным захопе рынку беларускага FM-радыёвяшчання... І «Спорт FM», на думку інфармаваных крыніц, быў тут толькі бачнай часткай айсберга, прыкрыццём для куды больш сур'ёзных планаў, чым камерцыйна нерацыянальны праект спартыўнай радыёстанцыі.

Зрэшты, «Народная Воля» ў бліжэйшы час вернецца да гэтай тэмы.

Ігар ІВАНОВІЧ.

ВІНШУЕМ!

Як «неперспектыўныя» становяцца першымі

Дзяржава не патраціла на пераможцу чэмпіянату Беларусі па лыжных гонках сярод юніёраў ні капейкі.

Наша газета ўжо паведамляла, што пасля Алімпіяды-2018 у Пхёнчхане вядомы беларускі лыжнік **Сяргей Далідовіч** вырашыў сканцэнтравацца на трэніроўках дзвюх сваіх дачок, якія таксама займаюцца лыжнымі гонкамі.

«Усе грошы, якія зараз укладваюцца ў іх падрыхтоўку, з маёй кішэні, – распавёў Сяргей. – *Чаму дзеці не трэніруюцца ў спартыўнай школе? Тут досыць складаная сітуацыя. Старэйшай дачцэ Вользе 18 гадоў, яна юніёрка. Узрост ёй ужо не дазваляе займацца ў ДЮСШ, а школы вышэйшага спартыўнага майстэрства ў Мінску няма. У Раўбічах ёсць рэспубліканскі цэнтр, але там збіраюць спартсменаў з усёй краіны. Атрымліваецца, што ў цэнтр яе не хочуць браць, а ДЮСШ яна ўжо перарасла. І калі б тата не быў лыжнікам і не меў зараз дастаткова вольнага часу, то на занятках гэтым відам спорту можна было б ставіць крыж. І гэта ўлічваючы тое, што ў нас у краіне юніёрак можна, вобразна кажучы, па пальцах пералічыць. Летам на рэспубліканскіх спаборніцтвах беглі, здаецца, усяго дзесяць юніёрак, якіх сабралі па ўсёй краіне. Гэта разам з маёй дачкой, якую я рыхтую сам.*

А ў сярэдняй дачкі, 13-гадовай Дар'і, выйшаў невялікі канфлікт з трэнерам, і той адмовіўся яе трэніраваць. Не хачу зараз распавядаць, хто там вінаваты, але ў выніку давялося займацца з абедзвюма дочкамі. Зараз рыхтуемся да спаборніцтваў, пабачым, чаго мы вартыя».

Днямі стала вядома, што і без удзелу дзяржавы ў краіне можна выхоўваць пераможцаў.

«Атрымалася тое, да чаго імкнуліся, – паведаміў **Сяргей Далідовіч**. – *На чэмпіянаце Беларусі па лыжных гонках сярод юніёраў выступала мая старэйшая дачка Вольга. Заняла першае месца і два разы была трэцяй. Нядрэнна для «неперспектыўных» і «непатрэбных» спартсменаў! Дачка патрапіла на юніёрскі чэмпіянат свету, так што тата задаволены. І дзякуй усім з федэрацыі і сябрам-трэнерам, хто дапамог намазаць лыжы!»*


23 студзеня возьме ўдзел у стартах і Дар'я Далідовіч – яшчэ адна «неперспектыўная» дачка славутага лыжніка.

«Не апускайце рукі, калі вам кажуць, што вы ніхто і нішто», – кажа былы спартсмен.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Вольга МАЗУРОНАК: «Ён з бабуляй цудоўна знаходзіць агульную мову»



Лепшая лёгкаатлетка Беларусі адправілася на зборы ў Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку і адказала на пытанні «Народнай Волі».

На апошняй Алімпіядзе ў Рыа беларуская марафонка **Вольга Мазуронак** заняла ганаровае 5-е месца, а ў мінулым годзе была пераможцай на чэмпіянаце Еўропы.

І поспехі ацанілі! Днямі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб прысуджэнні Вользе Мазуронак спецыяльнай прэміі «Беларускі спартыўны алімп за 2018 год», таксама яна была прызнана лепшай лёгкаатлеткай мінулага года.

Але, як кажуць, святы прыходзяць і сыходзяць, а працаваць трэба заўсёды. Зараз спартсменка -- на трэніровачным зборы ў ПАР…

– Вельмі прыемна атрымаць чарговую ўзнагароду, але пачаўся новы год, і трэба зноў пачынаць з нуля, – кажа Вольга. – Правяду каля 40 дзён у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы...

– Чаму для збораў выбралі менавіта гэтую краіну?

– Умовы для падрыхтоўкі там, можна сказаць, ідэальныя. Па-першае, дома ў зімовых умовах для марафонцаў трэніравацца не вельмі камфортна. Па-другое, у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы можна займацца на вышыні 1600 метраў, а для нашага віду спорту гэта тое, што трэба.

У гэтым годзе для мяне галоўным стартам будзе чэмпіянат свету, таму трэба падрыхтавацца на ўзроўні.

– Паездка фінансуецца не з уласнай кішэні?

– Ёсць дзяржаўная падтрымка, таму тут ніякіх праблем не ўзнікае.

– У вас, наколькі вядома, дзесяцігадовы сын. З кім ён застаецца, калі маці знікае больш як на месяц?

– Ён з бабуляй цудоўна знаходзіць агульную мову. У гэтым плане я не хвалююся…

Алесь СІВЫ.
Фота БЕЛАПАН.

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ

«Таэквандо нават памяць паляпшае…»

Што такое таэквандо, і чым адрозніваецца ад іншых усходніх адзінаборстваў? Наш суразмоўца – дырэктар спартыўнага клуба «Каскад», старшыня Беларускай рэспубліканскай арганізацыі таэквандо, уладальнік чорнага пояса 5-га дана ***Алег ПРАНЕВІЧ.***



– Алег Юр'евіч, як вы прыйшлі ў таэквандо?

– Як і многіх хлопчыкаў, мяне ў дзяцінстве вабілі баявыя мастацтвы, і гадоў з дванаццаці я пачаў займацца таэквандо. У секцыю прывяла маці. Мне падабаецца, што таэквандо мае дынамічную ўдарную тэхніку ног і рук, захоўвае прыцягальную відовішчнасць, эфектыўнасць для самаабароны і ў той жа час не з'яўляецца высокатраўматычным відам спорту. Да таго ж гэта цэлая філасофія.

Праўда, мне «пашанцавала» атрымаць траўму паясніцы, на якую я спачатку не звяртаў увагі. Аднак з цягам часу пасля маіх падпрацовак грузчыкам (хлопчыку хацелася мець кішэнныя грошы) траўма пра сябе нагадала. Дайшло да таго, што я не змог займацца спортам і вымушаны быў зрабіць вялікі перапынак. Шмат хадзіў па лекарах, і ніхто нічога не мог зрабіць. Маўляў, так і павінна цяпер быць.

Стаў працаваць трэнерам, але не здаваўся, бо было сорамна перад вучнямі. Шмат трэніраваўся, практычна не выходзіў з залы. У выніку знайшоў урача, які змог усё ж такі мне дапамагчы.

– Для абывацеля многія віды ўсходніх адзінаборстваў падобныя. У чым кардынальнае адрозненне таэквандо, скажам, ад розных відаў каратэ?

– Заснавальнік таэквандо генерал Чой Хонг Хі спачатку займаўся каратэ, у яго нават чорны пояс 2-га дана па каратэ. Таму зразумела, што ёсць некаторыя падобныя элементы ў комплексах фармальных практыкаванняў, якія называюцца «тулі» ў таэквандо і «ката» – у каратэ. Аднак у адрозненне ад каратэ ў таэквандо больш развіта дынамічнасць рухаў і пераважае высокая тэхніка ног.

– На зімовай Алімпіядзе-2018 у Пхёнчхане адбыўся «гістарычны момант» – дэманстрацыйнае выступленне каманд таэквандыстаў з Паўднёвай і Паўночнай Карэі. Верыце, што таэквандо можа паспрыяць прымірэнню паміж дзвюма краінамі?

– Таэквандо – гэта нацыянальнае карэйскае баявое мастацтва, якое належыць як Паўднёвай, так і Паўночнай Карэі. Аднак дзве краіны практыкуюць зусім розныя накірункі.

Нягледзячы на гэта, як сказаў прэзідэнт Сусветнай федэрацыі таэквандо Чо Чжонвон, гэты від спорту, безумоўна, можа выкарыстоўвацца як ключ да адкрытага дыялогу і паслаблення напружанасці паміж дзвюма Карэямі.

–За гады вашай трэнерскай дзейнасці ці заўважна павелічэнне цікавасці беларускай моладзі да гэтага віду спорту? З якой матывацыяй бацькі прыводзяць да вас дзяцей?

– Як даказалі навукоўцы, таэквандо паляпшае памяць і канцэнтрацыю ўвагі, спрыяе развіццю самадысцыпліны, самавалодання і ўпэўненасці ў сабе. Яно выкарыстоўваецца не толькі для фізічнай падрыхтоўкі, але і як сістэма выхавання і фарміравання асобы. Гэта пераканаўчая матывацыя для бацькоў прывесці дзіця ў гэты від спорту. Таксама зараз некаторыя падлеткі захапляюцца сучаснай паўднёвакарэйскай масавай культурай (поп-музыкай, тэлесерыяламі), што атрымала назву «карэйская хваля». Таму яны пачалі цікавіцца і карэйскім баявым мастацтвам.

Але ў апошні час набор вучняў цяжэй рабіць, чым раней. Гэта звязана з тым, што ўзрасла прапанова на рынку паслуг навучання розным баявым мастацтвам.

– Як вы адзначылі раней, таэквандо – гэта не проста фізічныя практыкаванні і «ўдары нагамі», але і духоўны складнік. Наколькі, на ваш погляд, філасофія таэквандо адпавядае менталітэту беларусаў? Ці ўплываюць нацыянальныя асаблівасці на падыходы навучання таэквандо?

– Таэквандо створана карэйцамі як спосаб нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ў перыяд японскай акупацыі. Зразумела, на яго філасофіі адбіўся менталітэт і культура карэйцаў. Я б сказаў, што азіяцкі менталітэт у цэлым больш схільны да гэтага баявога мастацтва, у аснове якога глыбокая пашана і падпарадкаванне бацькам, настаўнікам, старэйшым. У Карэі, напрыклад, заняткі таэквандо паўсюдна ўключаны ў праграмы школ, універсітэтаў, іншых адукацыйных устаноў, і вялікая ўвага надаецца закласці з дзяцінства ў вучня філасофскія і духоўна-маральныя прынцыпы гэтага баявога мастацтва.

У Беларусі навучанне класічнаму таэквандо значна складаней, улічваючы адрозненне менталітэту. Уключэнне заняткаў таэквандо ў праграмы ўстаноў адукацыі не атрымала пакуль масавага распаўсюджання. Самі вучні нашых клубаў больш аддаюць перавагу спартыўным дасягненням, медалям, чым маральным аспектам.

– Якія найбольш значныя перамогі вашых вучняў і якія планы наперадзе?

– 80 працэнтаў нацыянальнай зборнай Беларускай асацыяцыі таэквандо ITF – прадстаўнікі клуба «Каскад». Вучні заваёўвалі залатыя і бронзавыя медалі на Кубку свету па таэквандо ITF, сярэбраныя медалі чэмпіянатаў Еўропы і бронзу чэмпіянату свету.

А ў мінулым годзе клуб «Каскад» заняў першае месца ў агульным заліку на Кубку Еўропы і Кубку ITF. Зараз зборная клуба займаецца падрыхтоўкай да чэмпіянату свету, які пройдзе вясной у Германіі.

– Ёсць меркаванні, што ў Беларусі складана зрабіць спартыўную кар'еру ў таэквандо, але заўсёды маюцца перспектывы для беларускіх спартсменаў за мяжой. Як не страціць матывацыю развіваць гэты від спорту ў нашай краіне?

– У кожным відзе спорту ёсць магчымасць з'ехаць кудысьці за мяжу, аднак для мяне гэта пройгрышны варыянт. Сэнс баявога мастацтва не ў тым, як стварыць лепшае для сябе, а аддаць нешта іншым. Дарэчы, патрыятызм – неад'емная частка таэквандо як спорту і баявога мастацтва.

Ганна ВЯЖЭВІЧ.

СУСТРЭЧЫ

Незвычайнае захапленне беларуса з польскага Падляшша



Адну з самых папулярных і вялікіх у Сеціве беларускіх бібліятэк стварыў беластоцкі журналіст Яраслаў Іванюк.

Жаданне ствараць

– У 2000 годзе ў мяне нарадзіліся два дзіцяці, – *смяецца Ярэк.* – Мой сын і «Камунікат». А рабіць сайт, дарэчы, навучыла жонка.

Падрабязнасці 18-гадовай даўніны Яраслаў згадвае на прыгожай беларускай мове. Іванюк – класічны прадстаўнік беларусаў Падляшша: нарадзіўся, вырас і жыве ў Польшчы, але сам – этнічны беларус.

– Я гадаваўся ў сям'і, дзе па-польску нават не размаўлялі. Толькі на мове! – *тлумачыць Ярэк.* – Не літаратурнай, канешне: у Бельску-Падляшскім мы гаворым на нашым мясцовым дыялекце. Але школа ў мяне была беларуская, ліцэй – таксама беларускі, імя Тарашкевіча. Пытання нават не ўзнікала – беларус я ці паляк! І сына свайго я запісаў беларусам.

Таленавіты журналіст, прафесійны гісторык, харызматычная асоба. Пра такіх, як Іванюк, звычайна кажуць: «чалавек справы». Падаецца, што менавіта з жадання ствараць і з'явілася ўся гэта гісторыя пад назвай «Камунікат».

– Ой, якія там напалеонаўскія задумы! Пасля ўніверсітэта і некалькіх гадоў працы на «Польскім радыё для замежжа» я вярнуўся з Варшавы на Беласточчыну. Працаваў на «Радыё Беласток» і супрацоўнічаў з Беларускай рэдакцыяй у Варшаве. А вы ж цудоўна ведаеце, што гэта такое. Прагучала праграма – і ўсё. А частку эфіраў хацелася ўсё ж такі захаваць. Перанесці іх, што называецца, на паперу. Так з'явіўся бюлетэнь «Камунікат», які я потым пачаў пераносіць у інтэрнэт.

– Першыя ўражанні згадаеце?

– Напачатку вельмі добра чыталі матэрыялы пад гістарычнай рубрыкай. Але я заўсёды думаў: калі ёсць такі сродак камунікацыі, як інтэрнэт, то ў ім павінна прыстунічаць і беларускае мастацкае слова! Так паціху дайшла справа і да літаратуры. Шчыра? Мне вельмі хацелася прэзентаваць яе менавіта адсюль, з Беласточчыны.

– Амбіцыйна!

– Але нам сапраўды цікава ўсё, што мае сувязь з беларускасцю ва ўсіх яе праявах. Зайдзіце на сайт – там ёсць перыёдыка, навуковыя даследаванні, слоўнікі, метадычныя дапаможнікі. Бывае, што кніжкі выходзяць на другім канцы свету. Але калі яны пра Беларусь – калі ласка!

– Адлегласць, атрымліваецца, не перашкода?

– Слухайце, калі з-за мяжы можна рабіць беларускае тэлебачанне, якія тады пытанні з інтэрнэт-бібліятэкай? Больш за тое, нягледзячы на, як вы кажаце, адлегласці, мы працуем толькі са згоды аўтараў! Заключаем дамовы, усё робім афіцыйна.

– Усім бы вашым калегам такую прынцыповасць!

– А трапілі аднойчы ў сітуацыю. Раптам чалавек пытаецца: «А па якім гэта праве вы аддалі мае кнігі на іншы сайт?» Мы здзівіліся. А як пачалі разбірацца, дык на тым сайце ўсе нашы рэсурсы! І гэта пры тым, што я заўсёды за тое, каб беларускага слова ў інтэрнэце было многа. Але давайце вырашаць падобныя пытанні усё ж такі больш элегантна. Хаця б спасылкі пазначаць, ці што.

У свабодным доступе

– Яраслаў, як быць стваральніку бібліятэкі з асабістымі прыхільнасцямі? Ёсць нейкія рэчы, якія дакладна не з'явяцца на вашых «палічках»?

– Графаманства – гэта адразу «не». Ніколі не будзе на сайце антыбеларускіх тэкстаў або нейкіх шавіністычных гісторый. Але не думайце: здаралася, што і нам адмаўлялі. Нагоды? Ды самыя розныя. Скажам, адзін пісьменнік не захацеў з намі супрацоўнічаць, таму што на «Камунікаце» ёсць аўтары, з якімі яму, цытую, «не па дарозе».

– Дарэчы, рабіць пісьменнікам персанальныя сторонкі – таксама ваша прыдумка?

– Нейкі я задужа станоўчы атрымліваюся *(смяецца)*. Між іншым, я ведаю, што многія пісьменнікі адмыслова не робяць сайты, а даюць чытачам менавіта нашы, камунікатаўскія, каардынаты. Адмыслова не робяць сваіх сайтаў. Бо ўсё неабходнае ёсць у нас: біяграфія, здымкі, творы. Так што недарэмна я працаваў па начах. Ну і зноў жа – усё ў свабодным доступе. Толькі спампоўвай ды чытай.

– Мара любога карыстальніка!

– Прысутнасць беларускага слова ў інтэрнэце і так не дужа вялікая. А калі мы яшчэ грошы за гэта будзем браць… Дарэчы, на «Камунікаце», калі вы заўважылі, ёсць шмат газет і часопісаў, якія маюць свае сайты, але мы і з імі дамовіліся! Каб у адным месцы была і тая ж «Народная Воля», і іншыя газеты.

– Скажаце – «іншыя». Сапраўдныя знаходкі! Прэса дакамп'ютарнага часу – не жарты.

– Алічбоўваем дзясяты год: самвыдат, незалежную прэсу, эміграцыйныя часопісы. Аказалася, што ў інтэрнэце няма не толькі газет пачатку 1990-х гадоў. Няма нават прэсы 2000-х! Прыйдзе час, калі за гэту справу возьмецца і нацыянальная бібліятэка Беларусі. Не хачу сказаць, што там нічога не робяць, не. Але, на жаль, мала што трапляе ў агульны доступ.

А вось цяпер уявіце: усю гэтую вялікую камунікатаўскую справу стварае маленькі калектыў, не больш за дзесяць чалавек. Хаця такім рэсурсам мусіць займацца сотня людзей, разважае Яраслаў.

– Больш за ўсё намаганняў ідзе на алічбоўку старых газет. Часта ў іх проста нечытабельны стан, патрэбна рэканструкцыя. А рэканструкцыя – гэта заўсёды час, людзі і грошы. Бо я перакананы: за кожную справу людзям трэба заплаціць. А з валанцёрамі пакуль што складана. Так што сродкі – як звычайна, самае балючае пытанне.

– Яраслаў, якая сёння статыстыка наведвання сайта?

– Скажу так: мінімум 1000 разоў на дзень сайт адкрываецца. І паколькі гэта не рэсурс навін, я лічу, што лічбы някепскія. Але бывае, што і яны павялічваюцца ў разы. Напрыклад, калі ў 2010-м у Беларусі былі выбары, мы паставілі на сайт «Малога канспіратара» (пра тое, як займацца апазіцыйнай дзейнасцю ва ўмовах палітычнага ціску). Спасылку на кніжку апублікаваў «Тут.бай», і паказчыкі скочылі ў дзясяткі разоў.

Поўны збор

– Яраслаў,чаго сёння не стае «Камунікату»?

– Я вельмі хачу пашырыць калекцыю аўдыякніг. І не проста пашырыць. Ёсць такая мара – іх рабіць! Скажам, з Зінаідай Бандарэнка мы пару гадоў таму запісалі «Птушак без гнёздаў» Ларысы Геніюш. Шыкоўна атрымалася. Я ўвогуле думаю, што сёння беларускую літаратуру варта было б папулярызаваць менавіта такім чынам.

– Цікава, а якія літаратурныя густы ў стваральніка бібліятэкі?

– То пойдзем у мой кабінет! Вось – на паліцах поўны збор Быкава, Караткевіча, усе нумары «Дзеяслова».

– І што – застаецца час на «пагартаць кніжку»?

– Ну як сказаць… Жыву я з журналістыкі. Акрамя радыё, працую ў Беларускім гістарычным таварыстве. Вечарамі-начамі раблю «Камунікат». Так вольным час – праблема. Апошнім часам кніжкі радзей чытаю, але часцей слухаю – падчас прабежак. Можа, таму мне так хочацца нарабіць на сайце аўдыябукаў.

На развітанне задаю Яраславу самае простае, але, па вялікім рахунку, самае галоўнае пытанне: а навошта гэта яму? Калі можна проста хадзіць на працу, высыпацца, займацца домам, сям'ёй. Адпачываць, нарэшце.

– Не, ну бывае, што стомішся, – *здаецца, нарэшце, Ярэк.* – Але як падумаю, што няма ў свеце такой краіны, з якой бы яшчэ ні разу не зайшлі на «Камунікат»… Напэўна, людзям гэта ўсё ж такі трэба.

P.S. *У чэрвені 2018 года Яраслаў Іванюк разам са сваімі сябрамі-журналістамі Юрыем Калінам і Міхалам Сцепанюком заснаваў Фонд Kamunikat.org. У планах не толькі далейшае развіццё інтэрнэт-бібліятэкі, але таксама арганізацыя канцэртаў, вечарын, канферэнцый, праца з моладдзю.*

Аліна СТРАШКЕВІЧ.



Январь

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Февраль

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28			

Март

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

Апрель

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30					

Май

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

Июнь

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30

Календарь основных православных праздников и постов

28 апреля 2019 года – Светлое Христово Воскресение (Пасха).

Двунадесятые непереходящие праздники
7 января – Рождество Христово.
19 января – Крещение Господне (Богоявление).
15 февраля – Сретение Господне.
7 апреля – Благовещение Пресвятой Богородицы.
19 августа – Преображение Господне.
28 августа – Успение Пресвятой Богородицы.
21 сентября – Рождество Пресвятой Богородицы.
27 сентября – Воздвижение Креста Господня.
4 декабря – Введение во храм Пресвятой Богородицы.

Двунадесятые переходящие праздники
21 апреля – Вход Господень в Иерусалим.
6 июня – Вознесение Господне.
16 июня – День Святой Троицы. Пятидесятница.

Великие праздники
14 января – Обрезание Господне.
7 июля – Рождество Иоанна Предтечи.
12 июля – Святых апостолов Петра и Павла.
11 сентября – Усекновение главы Иоанна Предтечи.
14 октября – Покров Пресвятой Богородицы.

Церковные многодневные посты
11 марта – 27 апреля – Великий пост.
24 июня – 11 июля – Петров пост.
14 – 27 августа – Успенский пост.
28 ноября 2019 года – 6 января 2020 года – Рождественский пост.

Церковные однодневные посты
Среда и пятница всего года, за исключением сплошных седмиц и Святок.
18 января – Крещенский сочельник (Навечерие Богоявления).
11 сентября – Усекновение главы Иоанна Предтечи.
27 сентября – Воздвижение Креста Господня.

Сплошные седмицы в 2019 году
7–17 января – Святки.
17–23 февраля – Мытаря и фарисея.
4–10 марта – Сырная (Масленица).
28 апреля – 4 мая – Пасхальная (Светлая).
16 – 22 июня – Троицкая.

Дни особого поминовения усопших
2 марта – Суббота мясопустная (Вселенская родительская суббота).
23 марта – Суббота 2-й седмицы Великого поста.
30 марта – Суббота 3-й седмицы Великого поста.
6 апреля – Суббота 4-й седмицы Великого поста.
7 мая – Радоница.
9 мая – Поминовение усопших воинов.
15 июня – Суббота Троицкая.
2 ноября – Суббота Димитриевская.

Календарь основных католических праздников

1 января – Пресвятой Богородицы Девы Марии.
6 января – Богоявление (Три короля).
13 января – Крещение Господне.
25 января – Обращение Святого апостола Павла.
2 февраля – Сретение Господне.
11 февраля – Лурдской Богоматери.
6 марта – Пепельная среда (начало Великого поста).
10 марта – Первое воскресенье Великого поста.
17 марта – Второе воскресенье Великого поста.
19 марта – Святого Иосифа, обручника Пресвятой Девы Марии.
24 марта – Третье воскресенье Великого поста.
25 марта – Благовещение.
31 марта – Четвертое воскресенье Великого поста.
7 апреля – Пятое воскресенье Великого поста.
14 апреля – Вербное воскресенье.
18 апреля – Великий четверг.
19 апреля – Страстная пятница.
20 апреля – Святая суббота.
21 апреля – Пасха. Воскресение Господне.
22 апреля – Пасхальный понедельник.
25 апреля – Марка Евангелиста.
28 апреля – Воскресенье Божьего милосердия.
29 апреля – Екатерины Сиенской.
3 мая – Святых апостолов Филиппа и Иакова.
10 мая – Матери Божьей Логишинской.
13 мая – Матери Божьей Фатимской.
14 мая – Святого апостола Матфия.
16 мая – Андрея Боболи.
30 мая – Вознесение Господне.
31 мая – Посещение Девой Марией Елизаветы.
9 июня – Сошествие Святого Духа (Пятидесятница).
10 июня – Пресвятой Девы Марии, Матери Церкви.
13 июня – Господа нашего Иисуса Христа, Наивысшего и Вечного Пастыря.
16 июня – День Святой Троицы.
20 июня – Пресвятого Тела и Крови Христа.
24 июня – Рождество Святого Иоанна Крестителя.
28 июня – Святейшего Сердца Иисуса.
29 июня – Непорочного Сердца Пресвятой Девы Марии. Святых апостолов Петра и Павла.
2 июля – Будславской Божьей Матери.
3 июля – Святого апостола Фомы.
11 июля – Бенедикта Нурсийского.
16 июля – Пресвятой Девы Марии Кармильской.
23 июля – Бригитты Шведской.
25 июля – Святого апостола Иакова.
6 августа – Преображение Господне.
9 августа – Терезы Бенедикты Креста.
15 августа – Успение Пресвятой Богородицы.
22 августа – Матери Божьей Царицы.
24 августа – Святого апостола Варфоломея.
26 августа – Матери Божьей Ченстоховской.
29 августа – Усекновение главы Иоанна Крестителя.
8 сентября – Рождество Пресвятой Богородицы.
12 сентября – Святого имени Марии.
14 сентября – Воздвижение Святого Креста Господня (престольный).
15 сентября – Божьей Матери Скорбящей.
21 сентября – Святого апостола Матфея.
29 сентября – Святых архангелов Михаила, Гавриила и Рафаила.
2 октября – Ангелов-Хранителей.
7 октября – Девы Марии Святого Розария.
18 октября – Святого Луки Евангелиста.
28 октября – Святых апостолов Симона и Иуды.
1 ноября – Всех святых.
2 ноября – Поминовение усопших.
9 ноября – Освящение Латеранской базилики.
16 ноября – Божьей Матери Остробрамской.
21 ноября – Введение во храм Пресвятой Богородицы.
24 ноября – Христа, Царя Вселенной.
1 декабря – Первое воскресенье Адвента.
8 декабря – Непорочного зачатия Пресвятой Девы Марии. Второе воскресенье Адвента.
12 декабря – Матери Божьей Гваделупской.
15 декабря – Третье воскресенье Адвента.
22 декабря – Четвертое воскресенье Адвента.
24 декабря – Вигилия Рождества Христова.
25 декабря – Рождество Христово.
26 декабря – Стефана Первомученика.
27 декабря – Святого апостола Иоанна Богослова.
28 декабря – Святых невинных младенцев Вифлеемских.
29 декабря – Святого семейства.

Календарь еврейских праздников

21 января – Новый год деревьев.
5 февраля – Рош ходеш Адар.
19 февраля – Пурим катан.
25 февраля – Таатнит Эстер.
7 марта – Рош ходеш Адар.
20 марта – Пост Эстер.
21 марта – Пурим.
6 апреля – Рош ходеш Нисан.
19 апреля – Пост первенцев.
20 апреля – Песах.
5 мая – Рош ходеш Ияр.
19 мая – Песах шени.
23 мая – Лаг ба-омер.
4 июня – Рош ходеш Сиван.
9 июня – Шавуот.
3 июля – Рош ходеш Тамуз.
21 июля – Пост 17 Тамуза.
2 августа – Рош ходеш Ав.
11 августа – Пост 9 Ава.
31 августа – Рош ходеш Элул.
30 сентября – Рош а-Шана.
2 октября – Пост Гедалии.
9 октября – Йом-Киппур.
14 октября – Суккот. Праздник кущей.
21 октября – Шмини Ацерет.
21 октября – Симхат Тора.
29 октября – Рош ходеш Хешван.
28 ноября – Рош ходеш Кислев.
23 декабря – Ханука.
28 декабря – Рош ходеш Тевет.

** Все еврейские праздники начинаются накануне вечером после захода первых трех звезд.*

Мусульманские праздники

7–8 марта (26–27 раджаба) – Ночь Рагаиб (женитьба родителей Пророка Мухаммада).
2–3 апреля (26–27 раджаба) – Ночь Мирадж (вознесение к Аллаху Пророка Мухаммада).
19–20 апреля (14–15 шаабана) – Ночь очищения от грехов (лейлят-аль-бараа).
6 мая (1 рамадана) – Начало мусульманского поста (Ураза).
31 мая – 1июня (26–27 рамадана) – Ночь предопределения (лейлят-аль-кадр).
4 июня (1–3 шавваля) – Праздник разговения, Ураза-байрам (Ид аль-фитр).
10 августа (9 зуль-хиджа) – День Арафа (стояние на горе Арафат).
11–14 августа (10–13 зуль-хиджа) – Праздник жертвоприношения, Курбан-байрам (Ид аль-адха).
31 августа (1 мухаррама) – Начало 1441 года от Хиджры Пророка.
9 сентября (10 мухаррама) – День Ашура (день поминовения пророков и посланников Аллаха).
8–9 ноября (11–12 раби аль-авваля) – День рождения Пророка Мухаммада (мавлид ан-наби).

** Даты мусульманских праздников и памятных дат определены соответственно астрономическому лунному календарю и приведены для Беларуси. Могут отличаться от сведений других источников в связи с разной трактовкой момента наступления новолуния.*

Июль

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

Август

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30	31	

Сентябрь

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30						

Октябрь

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Ноябрь

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	

Декабрь

ПН	ВТ	СР	ЧТ	ПТ	СБ	ВС
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30	31					

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Паколькі ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 14.01.2019 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 23 025 экз. Заказ № 92.

9 772071 964000 19004